чается в ознакомлении с объектами через решение логических задач. В музейной деятельности применяются игровые методы проведения занятий краеведческой направленности. Игра способствует развитию познавательного интереса, формированию прочных знаний, развивает интеллектуальную и эмоциональную сферу учащихся. Дети легко общаются, дружат в параллели, сотрудничают в команде, учатся быть экскурсоводами, возникает желание заниматься проектной деятельностью. С увлечением прошла игра брейн-ринг «История Витебска», игра «История города Витебска в названиях улиц» и др. В музейной комнате проводятся лектории краеведческой направленности, уроки истории, посвященные Великой Отечественной войне.

Таким образом, работа школьной музейной комнаты является очень важным и значимым компонентом в процессе гражданско-патриотического воспитания. Она является центром гражданско-патриотического и духовно-нравственного воспитания учащихся. Краеведческая деятельность позволяет воспитывать патриота и гражданина на конкретных примерах из истории школы, истории родного города. Учащиеся получают возможность развивать свои творческие способности через исторический поиск и исследование. Активная поисковая, экспозиционная и образовательно-воспитательная деятельность позволяет формировать у учащихся историческое сознание, воспитывать патриотизм, уважение к прошлому своей страны и понимание ценности мира.

1. Леонькина, А. Имя, которым гордимся / А. Леонькина // Вечерний Витебск. – 2024. – № 11. – С. 2.
2. Победители. Мария Маценко. – URL: https://youtu.be/BCasG6Ic3xQ?si=Xqy4qW1fH47NZnv (дата обращения: 09.09.2025).
3. Соколова, Л. В. Организация деятельности школьного музея : учеб.-метод. пособие / Л. В. Соколова, А. В. Молчанова. – М. : ГОУ Педагогическая академия, 2012. – 108 с.

**Міхайлец М.А.**

## ІНСІТНАЕ МАСТАЦТВА ПАСТАЎШЧЫНЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ ІОСІФА ГАРБУНОВА

Інсітнае (наіўнае) мастацтва Пастаўшчыны – непрафесійная форма мастацкай культуры рэгіёна з глыбокімі народнымі каранямі і традыцыямі. Мэта артыкула – выявіць асаблівасці інсітнага мастацтва Пастаўскага рэгіёна на прыкладзе творчасці Іосіфа Іосіфавіча Гарбунова. Асноўная крыніца – інтэрв’ю з майстрам, узятае ў ліпені 2024 г. падчас этнаграфічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дапамогу ў інтэрв’юіраванні і апрацоўцы матэрыялаў аказалі Алюніна І., Голуб А., Доўнер М. і Раманенка Ю.

Інтэрв’ю з Іосіфам Іосіфавічам было ўзята на яго сядзібе ў вёсцы Жуперкі Пастаўскага раёна. Мясціны тут надзвычай маляўнічыя – вёска знаходзіцца на беразе адразу чатырох азёр, а хата і сядзіба І.І. Гарбунова ўпрыгожаны творамі аўтара: фігурамі птушак, лясных звяроў, барэльефамі.

Карані творчасці Іосіфа Гарбунова – у ягоным дзяцінстве. Яго маці, як і сам Іосіф Іосіфавіч, паходзіла з вёскі Пруднікі, што як і Жуперкі знаходзіцца недалёка ад Варапаева. Маці І. Гарбунова займалася размалёўкай дываноў: “Маляванкі, ну тыпу, роспіс ёсць такой – маляванка. На чорным фоне. Яны в Вільню з’ездзілі, краскі покупалі, самі рабілі. І вот яна відокі, як тады звалі, на сцякле ружы, такое. Яна рісавала. Малы я быў тады. Яна з 1924 года. Яна малявала – мяне яшчэ на свеце не было. Яна пры Польшчы ў школу хадзіла. Яна малявала тоже з детсва. Раньша ж было, маляванкі такія: рэчка, гусь які. Ну не жывапісь, маляванкі” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

У Іосіфа Іосіфавіча, як і ў многіх дзяцей пасляваеннай пары, было цяжкае дзяцінства: “Іх (*сям’ю маці – заўв. аўтара*) во время войны хацелі растраляць, сажглі, голых выкінулі. Бацька з фронту інвалід. Іх бамбілі, ён ляжаў, мароз – лёгкія застудзіў. Сейчас далі вторую групу, а тады трэцью. Там плячо перабіла яму. Увязалі туга. […]

Бацьку далі 3 групу, яго чуць вецярком хваціць – васпаленіе лёгкіх. Тады была трэцяя група, мо 17 рублей плацілі. Трудна было тады. Ніякіх красак. Пра гэта разгавора не было. “Куда ты, − кажуць, − сваім рылам лезешь. У калхоз!”. Хоць бы адзін цюбік прыслалі” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Пачаў маляваць І.І. Гарбуноў яшчэ ў дзяцінстве: “Я яшчэ да арміі рісавал, на сцекле пісал. Я ж у школе, патом да арміі… Вот сядзіць бацька – я нарісую яго, матку. […] Партрэт маткі. Пачтальёнка прідзёт, гаваріт, штобы я каталог выпісаў. А не было ўналічіі. Тады хацеў паступаць. Мне прісалалі саветы: “Нам художники не нужны, нам нужны трактористы-механизаторы и работники сельского хозяйства”. І паспарта тагда не давалі. І мне не далі. Я паспарт выбіл, я запісался на страіцельства Лукомльскай ГРЭС. А тады не паехаў, забраў паспарт. А тады не знаў пра вучылішчы художэственные, тады іх нідзе не пячаталі. І проста як хоббі якое, увлеченіе” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Усё ж такі сярэднюю мастацкую адукацыю Іосіф Гарбуноў атрымаў у Маскве: “Масква, Баумунскі раён, Армянскі перавулак. І там туды іспалком адправіў. Мы там 5 лет вучыліся. У мяне дыплом не з высшым абразаваніем. У вучылішчы я вучыўся 5 лет. Сначала тры, а патом павышэнный курс” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым). Там Іосіф Іосіфавіч атрымаў спецыяльнасць: “Я-та художнік-дэкаратар, графік. Толька плакатная жывапісь. В савецкае время пад кабінеты, актавыя залы афарміцельскія работы гэтыя, вот. Графік-художнік, шрыфты” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Пазьней, калі працаваў афарміцелем, Іосіф Гарбуноў самастойна авалодаў іншымі тэхнікамі: “А гэта ўсё: жывапісь, лепка, чаканка, разьба – усё сам. […] У мяне вісіць адна, відзелі? Гэта я дзелаў усё. І чаканкі вязлі маі на атэстацыю. Маркса, Энгельса, Леніна дзелал. В Савецкае время было. Плакаты метр на два, пісаніна, шрыфты гэтыя. Я тады дзелаў пяром, лессіровачнымі краскамі спеціальна, там лёгкі пігмент” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Адной з праблем, з якімі сутыкнуўся правінцыйны мастак, былі цяжкасці з набыццём фарбаў: “Пры Савецкім Саюзе я рісавал страіцельнымі краскамі, як пападзе. Яна (*прадаўшчыца ў мясцовай краме – заўв. аўтара*) мне сказала выпісаць художественных красак, дала мне гэты каталог. Ну, думаю, сейчас я начну рисовать. Тады пасылаю туда. Ответ – нет в наличии. Тады работаў у завозде. Я тады ў адзеле кадраў гавару, каб мне выписали направление для приобретения худматериалов на производство. Прихожу в магазин, говорю, что на производстве работаю. Дык там у іх кісці па 10 штук, яны ў іх капейкі стояць. Краскі – какіх хочаш. І я тады красак панабраўся. У меня гэтыя краскі і шчас ёсць. Толькі беліла дакупліваю. А я іх насабіраў гэтых красак – і цяпер ёсць. Многа ў меня было. Яшчэ і кісці тыя ёсць…” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Сёння майстар карыстаецца алейными фарбами: “Масляными красками художественными. […] Работаю маслом с натуры, по памяти. […] Я яшчэ пішу, можна пяром пісаць маслянымі, звёздачкай, для плакатаў. Я, значыць, у аптэке пакупаю скіпідар. Я тады браў яго цэлымі пачкамі. І тады, значыць, разваджу гэтым масляную краску, но краскі лессіровачные толька: ультрамарін, краплак, сажа. Гэта можна для пісьма іспользаваць. Я, значыць, карандашом рісунак нанашу. А потом всё последовательно” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Вось што адказаў Іосіф Іосіфавіч на пытанне, якія палотны ён выкарыстоўвае: “Ёсць халсты натуральныя, ёсць холст, што ўматываюць усякія цюкі. Я яго распраўляю, потом клей ПВА і мел разваджу. І тады пакрываю. Потом бялілам. Ну яшчэ можно пакрываць лакам перад пісьмом” (інтэрв’ю з І.І. Гарбуновым).

Вобразы і сюжэты для сваіх твораў І.І. Гарбуноў знаходзіць у навакольным прыродным і сацыяльным асяроддзі: жывёлы, лес, кветкі, сяляне, партрэты блізкіх і г.д. Часцей за ўсё малюе па памяці: “Ну, я ўсё рісую по памяці. Мне захацелася гразу нарісаваць, што вот яна ўвечар, парыў ветра... (*паказвае карціну – заўв. аўтара*) Воласы

троху тожа падправіць. Вось, яна з сабачкам гдзе-та ідзець па дароге дамой, і граза. Там яшчэ дзярэўня. […] Вот такая кампазіцыя па памяці. Нідзе такой нету карціны. Проста вот такое. […] А гэта вось волкі ідуць. Там яшчэ козы і дзіч, а яны з лесу. А што ж яшчэ? А, вось яшчэ сюжет дзярэўні. […] Тут, значыць, у калодца саседкі встреціліся, сплетні, паследнія новасці расказываюць. Гэта ўлыбаецца, а гэта нешта такое сур'ёзнае. Ну тут дама. […] Яны як-та, значыць, забор там, ўсё. Куры там ходзяць. Цень адгэтуль падае там троху. Тут нада отразіць цень, там, вунь, троху ёсць. Нада, штобы свет падал чуць. І на лошадзь нада. Ну, дзеравенскій сюжет. Вунь мужык ідзе. А гэта, вось, паследнюю новасць расказывает, ну тыпу сплетня. Гэта па памяці работа. Што прыдумаў, то... (*паказвае далей карціны – заўв. аўтара*). Нацюрморт, во, чаепіціе. Гэта па памяці. Гэта поле чудес глядзеў. Вода, пряники, торт там, кое-как цветы сообразил. Падстаўка, там троху отраженіе, прянікі, вада, заварка і тарелачкі – вот эта нацюрморт. А гэта з натуры партрэт унучкі. Цяпер ужо дачка ўнучку замуж выдаець. Яна врачом работает у Барысаве, анколог она. (*Паказвае наступную карціну – заўв. аўтара*). Гэта з натуры, кот Сіма такі быў. Вот, она держала кота. Цяпер дочка за яе старэй. А ей можа было лет 12. […] Вось тут нейкія коцікі. Усяго гэтага нідзе няма, гэта з галавы проста. Вось унучкі партрэт, калі яна маленькая была. Гэта з натуры работа. Тут, ну гэта кветка" (інтэрв'ю з І.І. Гарбуновым).

Пры стварэнні скульптур жывёл і карцін з імі Іосіф Іосіфавіч карыстаецца звесткамі, што пададзены ў Чырвонай кнізе: "Вось сава, ёсць Красная кніга, і там указаны размеры, дліна, там усё. […] Вот саколік, гэта з Краснай кнігі" (інтэрв'ю з І.І. Гарбуновым).

Хаця да разьбы і пластыкі Гарбуноў звярнуўся адносна нядаўна, яго творы, асабліва разьба па дрэве, вельмі ўражваюць. Сапраўдным шэдэўрам з'яўляецца выразаная майстрам з цэльнага кавалка дрэва ваза. На панадворку стаяць зробленыя аўтарам фігуры жывёл: "Ну вось, гэта казлы. Яны, значыць, каркас з провалакі там, унутры там бутэляк пустых, усё там сдзелана. Вось гэта львы, значыць. Там з дзерева, там з гліны леплена, сабрана ўсё ў кучу. Гэты дом, значыць, я адзін усё. Адзін год заліў фундамент, аблажыў, і ўсё. Ніхто ні кірпічы не падаў, ні раствору. Я ўсё сам делаў тут. Во і гараж. Дзелаў адзін. Вось гэты мядзедзь, ён с камянёў вылажаны. (*Інфармант паказвае скульптуру мядзведзя насупраць уваходу ў сваю хату, каля плоту - заўв. аўтара*). Вот, ён мёд любіць гэты. Штукатурка, провалака, каркас. Ну вот забор, значыць, гэты я дзелаў, дабіраў камні, каб па цвету што красівей было. Гэта я абкладываў ўсё, карнізы – гэта я ўсё сам. Рісавал, вырезал копіі з іх. Эту хату я адзін аблажыў. Касцёл рэманціравал Дуніловскій, мрамар лажыл. Ну і вся гэта работа. Ну ў мяне прафесія техніческая, строітельная і творческая. Ну гэта, так сказаць, дэкаратыўна-прыкладное іскуства" (інтэрв'ю з І.І. Гарбуновым).

Частка твораў захоўваецца ў аўтара, тым больш, што ён вельмі патрабавальны да сваёй творчасці і часта правіць свае карціны. Яшчэ іх можна пабачыць у Паставах: "30 карцін я падарыў у Пастаўскую раённую бальніцу. Чаканак можа штукі 4. Дарственную аформілі і ўсё. Паразвешаны паўсюль" (інтэрв'ю з І.І. Гарбуновым).

Часам майстар працуе на замову: "Бываець, бываець. Вот, я яшчэ партрэты пад заказ дзелаю, з фатаграфіі. Бываець яшчэ такое: дзярэўню снясуць, а памяць засталася, на фатаграфіі там жыллё. Вот, значыць, прыносіў мне вастанавіць яго. Там была адна фатаграфія: значыць, дом стаіць і там чалавечак. Ну я яго пріаброл, патом яны нашлі дзе-та на фатаграфіі голаву. Ну я дадзелаў яго. Яны гаварылі, што пахож. Ну вот так вот вастанавліваю. Еслі хочацца ўнукам, ці што там, ну фатаграфія ёсць, а там ужэ вастановіш неба жывапісна. Такие бывают случаи. Один батюшка церкви, которую сожгли, по архивах, по чертежу восстанавливали. И я рисовал. Там скажут: "Ах, крыльцо было не так". Там тое, вазіўся з імі тады" (інтэрв'ю з І.І. Гарбуновым).

Інсітнае мастацтва Пастаўшчыны з'яўляецца часткай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці "Інсітнае (наіўнае) мастацтва Віцебшчыны", якая 20 лютага 2020 г. Была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 23БК000140) [1], аднак такая ўвага з боку дзяржавы амаль не закранула Гарбунова. Іосіф Іосіфавіч з'яўляецца тыповым прыкладам майстра-самавука, які не патрабуе знешніх стымулаў для творчасці, ён творыць таму, што не можа не тварыць, таму ў выставах удзельчае неахвотна: "Не-не. Я выстаўляўся, а так времені нету і не знаю, дзе можна". На пытанне, ці запрашаюць яго з Пастаўскага дома рамёстваў, ён адказаў: "Быў я ў іх, яны мне пабілі вазу, я яе чуць вастанавіл" (інтэрв'ю з І.І. Гарбуновым). На жаль, пераемнікаў мастак не мае, хаця адзначае, што яго дачка "трохі малюе".

Такім чынам, І.І. Гарбуноў з'яўляецца тыповым інсітным мастаком, для якога галоўнай матывацыяй для творчасці выступае ўнутраны творчы парыў, а крыніцай натхнення з'яўляецца навакольны свет, і які не зацікаўлены ў камерцыялізыцыі сваёй творчасці. З боку дзяржавы карысным было б стварэць такім творцам спрыяльныя ўмовы для перадачы сваіх ведаў і навыкаў будучым пакаленням.

1. Традыцыі інсітнага (наіўнага) мастацтва Віцебшчыны // Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. – URL: https://heritage.gov.by/catalog/tradytcyi-insitnaga-naiunaga-mastatctva-vitcebshchyny (дата звароту: 19.09.2025).

**Михалик О.М.**

## НАСЛЕДИЕ, ХРАНИМОЕ БИБЛИОТЕКОЙ: РЕДКИЕ СМОЛЕНСКИЕ ИЗДАНИЯ XIX – НАЧАЛА XX В. (КНИЖНЫЕ ПАМЯТНИКИ)

*Ключевые слова:* книжные памятники, редкий фонд, Смоленская областная универсальная научная библиотека имени А.Т. Твардовского.

Редкий фонд Смоленской областной универсальной научной библиотеки имени Александра Трифоновича Твардовского составляет более 19 000 единиц хранения. Среди них – 1958 книжных памятника, зарегистрированных в государственном реестре, из них 151 изданы в Смоленске и представляют для нас особенную ценность.

Прежде всего – это четыре книги, признанные книжными памятниками по хронологическому признаку. Все они были изданы до 1830 г.

Это «Воинский устав о полевой пехотной службе» (1797). Он был напечатан в Губернской типографии «в следствии повеления Его высокопревосходительства господина генерала от инфантерии смоленского военного губернатора… Михаила Михайловича Философова». Цензор подтверждает, что он «слово в слово, кроме некоторых погрешностей» повторяет Устав, изданный в Санкт-Петербурге при Государственной военной коллегии в 1797 г.» [1, с. [2]]. В Уставе рассматриваются различные военные вопросы: о составе военных подразделений, правила построения, обучение рекрутов и мн. др. В книге также с отдельным шмуцтитулом помещены «Инструкции караульному офицеру» (12 с.).

Иван Яковлевич Сытин (1765–1835), выступил в роли издателя еще двух книг – это «Созерцание природы» Шарля Бонне (1804) в 2 частях, работа, посвященная естествознанию. В книге посвящение издателя «его превосходительству Степану Степановичу Апраксину, господину, генералу от кавалерии, Смоленскому военному губернатору....с истинным высокопочитанием усерднейше подносит издатель Иван Сытин» [2, с. 5–6].

Сытин основал свою типографию в Смоленске в 1795 г., переехав в провинцию из-за правительственной цензуры и закрытия независимых типографий. Изначально он управлял типографией Приказа общественного призрения, но с 1802 г. она перешла в его личную собственность.